**Марцынкевіч, Р.** Афганскае лета 1986-га / Р. Марцынкевіч // Веснік Глыбоччыны. — 2004. — 14 лют. — С. 2.

## АФГАНСКАЕ ЛЕТА 1986-ГА

*У гэты дзень пятнаццаць год назад апошнія часці абмежаванага кантынгенту савецкіх войск пакінулі Афганістан. Тады і закончылася апошняя для нас вайна – вайна без пераможцаў, бо іх, пераможцаў, у вайны і не бывае. Ёсць тыя, хто выжыў і вярнуўся дадому, і тыя, хто не дакахаў, не паспеў налюбавацца майскай квеценню садоў, залатым лістападам, бялюткім іскрыстым снегам...*

*Тыя, хто вярнуўся, не любяць расказваць аб пеpажытым, бо гэта той выпадак, калі цяжка перадаць словамі тое, што немагчыма забыць. А ў тых, хто загінуў на чужыне, сёння былі б ужо сыны-салдаты, такія, якімі былі яны самі. І дзякуй Богу, што тая неаб'яўленая вайна ў Афганістане была апошняй для беларускіх маці.*



Ванда Францішкаўна сына выхоўвала адна. Багдану было сем гадоў, калі памёр бацька, так і не паспеўшы пабудаваць дом. Той зруб, што рубіў муж, Ванда перавозіла ў Глыбокае сама. Абжывалася доўга, бо ў хаце была адна маленькая зарплата.

Багдан рос паслухмяным, дапытлівым, добра вучыўся. Пасля заканчэння школы (якраз 20 гадоў назад) паступіў у Магілёўскі тэхналагічны інстытут. Маці ганарылася адзіным сынам: будзе інжынерам. Але жыццё нечакана зрабіла рэзкі паварот. Пасля першага курса Багдана прызвалі ў армію. Ужо больш пяці гадоў ішла вайна ў Афганістане, і ніхто не мог сказаць, калі закончыцца гэтае пекла. На змену абстраляным, загартаваным у вайне хлопцам у Афганістан закідвалі 18-гадовых юнакоў, якія ледзь навучыліся трымаць у руках зброю.

– Я прызываўся ў армію з Магілёва. А службу пачынаў на Урале ў школе сяржантаў, – успамінае Багдан. – Ужо тады мы ведалі: закончым вучобу – і ў Афган. Так і сталася. У кастрычніку нас, наваспечаных сяржантаў, перавялі ў Ташкент. Там быў перавалачны пункт, каб салдаты маглі хоць крышку адапціравацца да кліматычных умоў, у якіх прадстаяла жыць і ваяваць.

У Ташкенце Багдан адстаў ад сваіх таварышаў па сяржанцкай школе. Ён захварэў на жаўтуху і надоўга трапіў у шпіталь. Але радасці, што атрымаў такую «адтэрміноўку», не было. Нарэшце дзень адпраўкі настаў. Ён быў змрочны, насуплены, і Багдан пакідаў Ташкент без шкадавання.

Кабул, куды даставіў самалёт чарговую партыю салдат, сустрэў суровай непрыступнасцю. Стаяў бясснежны люты, усё наўкол было шэрым, аднастайным і такім чужым, што да болю сціснулася сэрца. Але ўсе трымаліся, стараючыся не паказваць, што на сэрцы, жартавалі. Пра смерць не думалі. Толькі праз многа гадоў тыя, хто вярнуўся з той ванны, зразумеюць, што не вызваліцелямі яны былі ў той чужой краіне. А тады...

– Мы не разважалі пра палітыку, а рабілі тое, што патрабавалася ад нас, – скажа ў гутарцы Багдан.

Яго залічылі ў аўтамабільную брыгаду ва ўзвод аховы, і для юнака з Глыбокага пачалася вайна, якую позней назавуць бессэнсоўнай і нікому не патрэбнай. Наперадзе Багдана чакалі цяжкая хвароба (у Кабуле Багдан зноў захварэе на жаўтуху), баявыя аперадыі, страта сяброў... На кожным кроку падпільноўвала смерць. Яна літаральна дыхала ў патыліцу. І тады, звяртаючыся да медаліка Маці Божай Беззаганнай, ён прасіў заступіцца, не даць загінуць.



Той медалік дала яму матуля, калі выпраўляла ў войска. Аднойчы камандзір убачыў яго на шыі салдата і сказаў: «Сними. Солдату не положены излишества». Але гэта была не каманда, а хутчэй за ўсё просьба. Багдан падпарадкаваўся, бо не меў права не паслухацца. Ён зняў медалік і паклаў яго ў левую кішэню гімнасцёркі, ля сэрца. І калі аднойчы яго не аказалася на месцы, Багдана агарнуў страх.

Такога страху ён не зведаў нават тады, калі зайшоў у палатку, дзе, забіўшыся ў куток, сядзеў салдат і трымаў напагатове гранату. Багдан падышоў да салдата, паклаў руку на плячо, заглянуў у звар'яцелыя ад страху вочы:

– Не дури, друг. Всё будет хорошо, вот увидишь.

А потым паставіў на месца чэку, разжаў пальцы, якія мёртвай хваткай сціскалі гранату, забраў яе і выйшаў з палаткі. Пра сябе ў тыя хвіліны не думаў. Страху не было.

Увечары, калі панурая цішыня апусцілася на кішлак, дзе дыслакаваўся ўзвод аховы, Багдан напісаў маці аб сваёй згубе. Тыдні праз два атрымаў пісьмо, у якім быў маленькі абразок Маці Божай, заступніцы і апякункі. Страх безабароннасці адступіў. Да Багдана вярнулася надзея, што ен застанецца жывым. Але да чаканага загаду аб звальненні ў запас было яшчэ вельмі далёка. Ён лічыў дні, а яны не беглі, а цягнуліся як па смале. Салдаты хварэлі на малярыю і жаўтуху, ніяк не маглі прывыкнуць да моцна хларыраванай вады і афганскай спёкі, пастаянна адчувалі пачуццё голаду. Толькі маладосць брала сваё, і варта было схіліць галаву да падушкі, як тут жа ахутваў сон.

– Але чаканне дэмбелю было такім жаданым, што нават сярод ночы мы маглі беспамылкова назваць, колькі яшчэ дзён засталося ваяваць, – шчыра прызнаецца Багдан і са стосу здымкаў, зробленых фатографам-аматарам у Афганістане, выбірае адзін: «Я высылаў яго маме летам 1986 года».

З дазволу чытаю надпіс: «24 жніўня 1986 года. Да майго загаду (маецда на ўвазе аб звальненні – **Р. М.**) засталося 225 дзён. У Саюзе гэта не так і многа, а тут пражыць – зусім іншае».

У лістах да маці Багдан пісаў, што ў яго ўсё добра, не плакаўся і не скардзіўся. Але Ванда Францішкаўна сваім мацярынскім сэрцам прадчувала, як невыносна цяжка яе сыночку. Маліла Бога, каб уратаваў яе крывінку, адзінае, што ў яе ёсць. І добры Бог пачуў гэтую ахвярную малітву. Багдан вярнуўся дадому жывым і здаровым.

Упершыя па вяртанні дні вайна часта прыходзіла да яго ў снах. Ён бачыў убогія кішлакі, палонных «духаў», перапоўненыя шпітальныя палаты, знемагаў пад слякотным афганскім сонцам, прачынаўся ад узрываў... Але праўду кажуць: нічога не гоіць так душэўныя раны, як мілыя сэрцу

мясціны і спакойная хатняя абстаноўка. Прытупіўся боль афганскай вайны і ў душы Багдана Тумаша. І хоць ён лічыць Афганістан школай для сапраўдных мужчын, не можа дапусціць нават думкі, каб на такіх уроках вучыўся яго сын.

На афганскай зямлі ў складзе абмежаванага кантынгенту ваявалі каля 300 тысяч беларусаў. 877 з іх вярнуліся на радзіму рэйсамі «чорнага цюльпана», каля тысячы сталі інвалідамі, каля трохсот афганцаў ад хвароб і ран памерлі пасля вайны, многія і па сёння не пазбавіліся ад псіхалагічнай траўмы. У Багдана, як ён лічыць сам, усё ў пасляваенным жыцці склалася добра. Па вяртанні з арміі ён перавёўся на завочнае аддзяленне інстытута (к таму часу Ванда Францішкаўна ўжо была на пенсіі) і ўладкаваўся на работу на чыгуначны вакзал.

– Мае дзядінства праходзіла ля чыгункі (мы тады жылі ў Канстанцінаве). Магчыма, гэта і паўплывала на мой працоўны выбар. Не шкадую, што склалася менавіта так, – гаворыць мой субяседнік.

Выпускную дыпломную работу, якую абараніў на выдатна, Багдан пісаў па вытворчых даных мясакамбіната і меў запрашэнне працаваць на гэтым прадпрыемстве. Была магчымасць прадоўжыць вучобу ў аспірантуры. Але ен не спакусіўся на такія прапановы і застаўся працаваць на чыгунцы. Цяпер Багдан Тумаш – старшы прыёмаздатчык, чалавек паважаны і аўтарытэтны. Яго здымак, як лепшага работніка, сёлета змешчаны на раенную Дошку гонару.

У Багдана падрастае сын – яго радасць і надзея. Калі стане дарослым, бацька абавязкова раскажа яму пра сваё юнацтва І выпрабаванні, якія выпалі на яго долю. Раскажа так, нібыта гэта было ўчора, бо памяць непадуладна часу. І праз гады будзе веяць холадам пры ўспаміне аб тым гарачым афганскім леце 1986 года.

**Р. Марцынкевіч**